View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

# Метад інтэгравання міфалагічных, астральных і мастацкіх вобразаў паводле трылогіі Якуба Коласа "На ростанях"

**Я.І.Мірончык**

Праблема сучаснасці мае непасрэднае дачыненне да традыцыйных эстэтычных вучэнняў адлюстравання чалавекам рэчаіснасці. Але чалавек – суб'ектыўная істота. І каб пазбегнуць псіхічных паталогій, якія магчымы па прычыне ілюзорнага ўспрымання рэальнасці, ён павінен імкнуцца да непасрэднага псіха-эмацыянальнага кантакту з сусветам.

Рашэнне праблемы крытэрыяў адэкватнага адлюстравання рэчаіснасці, такім чынам мае вялікае значэнне і, у першую чаргу, таму, што дазволіць даволі дакладна вызначыць прафесійную арыентаванасць для кожнага навучэнца адпаведна яго развіццёвым здольнасцям.

Альберт Швейцэр лічыў, што сапраўдная этыка ахоплівае ўвесь свет, усё этычнае ўзыходзіць да адзінага этычнага прынцыпу – захавання і падтрымання жыцця.

Менавіта мастацкая літаратура (найперш родная) выконвае асноўную выхаваўча-адукацыйную функцыю ў грамадстве, дапамагае маладым самавызначыцца ў далейшым жыцці.

У беларускай літаратуры на сучасным этапе можна выдзяліць дамінуючы аналітычны метад раскадзіроўкі міфічна-астральнай сутнасці розных фальклорных сюжэтаў, вобразаў, якія захаваліся ў творах мастацкай літаратуры. На жаль сёння сэнс многіх міфічна-фальклорных сюжэтаў страчаны. Тым не менш міфалагічныя сюжэты больш як тысячу год таму назад мелі канкрэтную семантыку і выконвалі адукацыйна-выхаваўчыя функцыі.

Напрыклад, каб дзеці лёгка засвойвалі астранамічныя звесткі, нашы продкі пазначалі ўсе з'явы прыроды яскравымі эмацыянальнымі асацыяцыямі (слядамі ў падсвядомасці і свядомасці адначасна). Усім вядомы казачны Калабок. Сваімі акруглымі бакамі ён нагадвае Месяц, які памяншаецца пасля сустрэч з Зайцам, Мядзведзем, Воўкам і наогул знікае ў сузор'і Лісы.

Таку ж астранамічную семантыку маюць і іншыя фальклорныя сюжэты (напрыклад, казкі "Каза на лазе", "Каза і сямёра казлянят", верш Ф.Багушэвіча "Воўк і авечка"), у якіх адлюстравана нараджэнне бога Сонца Далібога ў перыяд зімовага сонцастаяння.

Раскадзіраваць змест многіх сюжэтаў дазваляе паганская міфалогія. Яскравым сведчаннем таму з'яўляецца міф пра Кашчунаву смерць, схаваную ў "Залатым яйку". Кашчун папярэдзіў Далібога, каб не разбіваў яйка, бо "Настане Канец Свету Белага!..." Адразу напрошваецца аналогія – яйка – атам – ядзерная рэакцыя, або яйка – клетка – мутацыя.

Як ні дзіўна, але менавіта алегарычныя вобразы жывой і нежывой прыроды дазваляюць чалавеку спасцігнуць дыялектыку быцця. Анімізм як галоўны элемент міфалогіі і фальклору дазваляе нам пабудаваць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

асацыятыўную мадэль сусвету, якая супадае з філасофскім вучэннем аб чалавеку як мікракосме – люстэрку макракосму. Дарэчы, паводле зноў-ткі паганскай міфалогіі чалавек з'яўляецца мадэдллю сусвету ("Род нарадзіў зямлю, Сонца выйшла з твару Яго, Месяц – з грудзей, зоркі – з вачэй, ночы – з думак Яго, вятры – з голасу).

Я.Колас у сваіх творах вырашаў праблему гарманізацыі ўзаемаадносін чалавека з прыродаю шляхам міфалагізацыі вобразаў. Нават назвы першай і другой аповесцяў трылогіі "На ростанях" ("У палескай глушы", "У глыбі Палесся") асацыіруюцца з міфічнай Нетраю зямною, адкуль бярэ свой пачатак жыццё, дзе жывіцца карэннямі міфічнае Дрэва Ведаў.

Жыццёвая мудрасць старых палешукоў, якія насяляюць Нетру, увасоблена аўтарам твора якраз у сімвалічным вобразе дрэва, што заўсёды цягнецца галінамі да солнца. Сімвал дрэва з'яўляецца спрошчаным варыянтам дахрысціянскай міфалагемы Сусветнага Дрэва. А ў хрысціянскай астральнай міфалогіі адпаведнікам Сусветнага Дрэва з'яўляецца Дрэва Багоў, або Лесвіца Якаба (Якуба).

Вобраз Знахаркі - вядунні бабкі Мар'і набывае семантычную значначнасць пасля ўзнаўлення міфа пра раду – багіню, якая, пашкадаваўшы першага чалавека, "слова боскае цудоўнае шапнула на вуха Еве", жонцы першачалавека, і гэта слова было вядуннае.

Сапраўднымі волатамі-асілкамі з'яўляюцца дзяды Мікіта і Грыгор, у казачным эпасе волаты перамагаюць уладара лесу мядзведзя (казка Чалавек і мядзведзь"). Стары Грыгор перамагае якраз мядзвідзіцу і забірае малое мядзведзянятка. Восьмідзесяцігадовы дзед Мікіта, як і стары Грыгор, "за пояс маладога заткне". Але галоўнае: ён – знахар-чараўнік". Самае цікавае, што ён мог прасунуць "рукі ў камяні-жарнавікі і пайсці з гэтымі камянямі, як з лёгкімі кацёлкамі, упрысядкі" танчыць. Паводле міфа, Пярун, ахоўваючы на выспе Вырай Дрэва Багоў, выкрасаў маланку і гром менавіта з зялёных каменных жорнаў, апранутых на рукі.

Паводле міфалогіі, волаты з'яўляліся не толькі нашымі продкамі, але і пасрэднікамі паміж жывымі і падземным богам Вялесам. Менавіта ў замагільным "іншацарстве" Вялеса бярэ свой пачатак Сусветнае Дрэва. Гэтак жа і сімвалічнае дрэва Лабановіча сягае каранямі ў самую нетру Палесся, дзе жывуць Вялесавы нашчадкі Мікіта, Грыгор, бабка мар'я, "тыя слупы, тыя падмуркі, на якіх трымаліся традыцыі сялянскай старажытнасці".

Вобразы дрэў, каласоў у Коласа набываюць асаблівае магічнае значэнне. Нездарма, паводле міфалогіі, у руках Ярыды жытнёвы колас сімвалізуе вечную ходу жыцця чалавека з пакалення ў пакаленне. У гармоніі чалавека з прыродаю пісьменнік бачыў магутны струмень ствараючай энергіі, так неабходнай нашаму грамадству, каб адрадзіць прафесійныя традыцыі беларускага народа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ